З мэтай фарміравання ў вучняў ведаў аб здароўі неабходна ўключаць у змест урока пытанні, звязаныя са здаровым ладам жыцця, выкарыстоўваць метады навучання, якія садзейнічаюць актывізацыі і развіццю ініцыятывы, асабістай творчасці, выкарыстоўваць гутарку, даследчую працу (з дадатковай літаратурай).

Для вырашэння праблемы каштоўнасных адносін вучняў да ўласнага здароўя неабходна выконваць санітарна-гігіенічныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу (тэмпературны і паветраны рэжым, рэгуляваць асвятленне ў кабінеце, асвятленне класнай дошкі; звяртаць асаблівую ўвагу на захаванасць асанкі і зроку навучэнцаў, на шум, якасць пітной вады, экалагічны стан кабінета, падтрымліваць чысціню і парадак у памяшканні і г. д.

Сярод адукацыйна-арганізацыйных фактараў неабходна адзначыць аб'ём вучэбнай нагрузкі, яе адпаведнасць узроставым і індывідуальным магчымасцям, арганізацыйна-педагагічныя ўмовы правядзення ўрока.

Адна з праблем, якая востра стаіць не толькі ў школе, але і ў грамадстве ўцэлым, – гэта гіпадынамія. Тэхнічны прагрэс вядзе да памяншэння рухомасці чалавека. Памяншаецца не толькі час, які павінен быць прысвечаны актыўным фізічным практыкаванням, але і час, праведзены на адкрытым паветры. Для вырашэння праблемы гіпадынаміі і зніжэння інтэлектуальнай актыўнасці навучэнцаў на працягу ўрока неабходна чаргаваць віды вучэбнай дзейнасці, сачыць за пасадкай вучняў, выконваць практыкаванні для зроку, праводзіць зарадку для вачэй, выкарыстоваць дынамічныя паўзы і фізкультурныя хвілінкі, ранішнюю зарадку перад першым урокам.

Для рацыянальнай арганізацыі вучэбнай дзейнасці вучняў на ўроках выкарыстоўваюцца відэаматэрыялы, сродкі інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій, што спрыяе развіццю і стымулюе пазнавальны інтарэс навучэнцаў, забяспечвае індывідуальны і дыферэнцыраваны падыход у працэсе навучання. Настаўнік кантралюе інтэнсіўнасць і працягласць самастойнай працы. З мэтай памяншэння псіхалагічнага напружання вучням падчас адказу варта дазваляць карыстацца апорнымі канспектамі. Настаўнік павінен забяспечыць даступнасць і пераемнасць інфармацыі, выкарыстанне адпаведных сродкаў нагляднасці і аптымальнай колькасці невядомых для вучням паняццяў, устанаўленне міжпрадметных сувязей.

Задача якаснага навучання прадмету цалкам немагчыма без дастатковага ўзроўню матывацыі навучэнцаў і забеспячэнні ўвагі на здароўі. Аналіз школьных фактараў небяспечнасці паказвае, што большасць пытанняў па захаванні здароўя навучэнцаў вырашаецца ў выніку штодзённай прафесійнай дзейнасці настаўнікаў. Сучасны настаўнік сваёй уласнай дзейнасцю захоўвае і ўмацоўвае здароўе вучняў, фарміруе ў яго неабходныя веды аб здаровым ладзе жыцця, вучыць выкарыстоўваць іх у паўсядзённым жыцці.

## РЭАЛІЗАЦЫЯ ІДЭЙ АДУКАЦЫІ Ў ІНТАРЭСАХ УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ

## THE IMPLEMENTATION OF THE GOALS OF EDUCATION FOR SUSTAINABLE DEVELOPMENT

***Т. Я. Казакевіч, В. П. Казырно***

***T. Kazakevich, V. Kazyrno***

*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гімназія № 9 г. Мінска»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*gymn9@minsk.edu.by*
*State Educational Establishment «Gymnasium 9 of Minsk», Minsk, Republic of Belarus*

Прапануецца метадычная распрацоўка экалагічнай накіраванасці для навучэнцаў школьнага ўзросту, прысвечаная Дню Зямлі. Артыкул будзе карысным для настаўнікаў, якія выкарыстоўваюць інтэрактыўныя тэхналогіі на занятках, пазакласных мерапрыемствах.

Methodological handbook on ecology for schoolchildren, dedicated to Earh Day. The article can be useful for teachers who use interactive technologies during classes and extra-curricular activities.

*Ключавыя словы*: дзень Зямлі, інтэрактыўныя тэхналогіі, экалагічная гульня, фарміраванне экалагічнай культуры.

*Keywords:* Earth Day, interactive technologies, ecological game, envirinmental behaviour development.

Асноўная мэта, якая ставіцца перад адукацыяй пры рэалізацыі інтарэсаў устойлівага развіцця, даць магчымасць ўплываць на якасць свайго жыцця за кошт набыцця адпаведных кампетэнцый. Найбольш папулярнымі мерапрыемствамі ў справе абароны і добраўпарадкавання навакольнага асяроддзя з'яўляюцца экалагічныя акцыі (уборка тэрыторыі, пасадка раслін), экалагічныя выставы і канцэрты, канферэнцыі, агульнашкольныя мерапрыемствы экалагічнага напрамку.

У нашай установе адукацыі штогод праводзіцца агульнашкольнае мерапрыемства «Дзень Зямлі», якое ўключае актуальныя формы работы з падлеткамі на перапынках, выхоўвае ў навучэнцаў імкненне беражлівых адносін да прыроды, спрыяе фарміраванню цікавасці да навакольнага свету і экалагічнай свядомасці.

Перад пачаткам мерапрыемства сіламі навучэнцаў рыхтуюцца відэаматэрыялы, прэзентацыі, афармляецца тэматычны стэнд з планам «Дня Зямлі» і экалагічным календаром дат. Экалагічны каляндар адлюстроўвае наступныя мерапрыемствы, правадзімыя на працягу года ва ўстанове адукацыі:

16 верасня – Міжнародны дзень аховы азонавага пласта Зямлі (конкурс «Эка-знакі»);

20 верасня – Дзень лесу (напісанне сачынення «Лес – наша багацце», выстава вырабаў з прыроднага матэрыялу «Дары лесу», збор макулатуры);

27 верасня – Дзень мора (напісанне эссэ-развважання);

4 кастрычніка – Дзень абароны жывёл (акцыя «Заапарк», конкурс рэбусаў і красвордаў);

29 снежня – Дзень біялагічнай разнастайнасці (конкурс фотаздымкаў);

22 сакавіка – Сусветны дзень вады (экалагічная акцыя «Жывая вада», гульня «Як эканоміць»);

1 красавіка – Дзень птушак (падрыхтоўка шпакоўняў);

18 красавіка – Дзень запаведнікаў і нацыянальных паркаў (віктарына на тэму «Чырвоная кніга», дабрачынная акцыя «Севастопальскі парк», «Чысты двор»);

22 красавіка – Дзень Зямлі;

5 чэрвеня – Дзень аховы навакольнага асяроддзя (конкурс «Малюнак на асфальце» для вучняў, якія наведваюць лагер);

17 чэрвеня – Дзень барацьбы з апустыньваннем і засухай («Сінема запрашае»).

У пачатку правядзення агульнашкольнага мерапрыемства вучні ў нацыянальных касцюмах сустракаюць дзяцей і дарослых у фае і збіраюць выказванні аб Зямлі. Выказванні пішуць адным словам на сцікерах ў форме кветак, лісця і прымацоўваюць на намаляванае дрэва.

На першым перапынку ідзе прэзентацыя, якая прысвечана сімволіцы свята, гісторыі, акцыям, якія раней праводзіліся ва ўстанове. На слайдзе «Сімволіка свята» можна ўбачыць тры сімвала – сцяг, лагатып і Звон Свету (рус. – Колокол Мира). На святкаванні выкарыстоўваецца неафіцыйны Сцяг Зямлі – фотаздымак планеты з космасу, размешчаны на палатне цёмна-сіняга колеру. У якасці лагатыпа, а часам нават сцяга, выкарыстоўваецца літара грэцкага алфавіта (**Θ**), выкананая травяніста-зялёным колерам на белым фоне. Зялёны, па традыцыі, сімвалізуе экалогію, экалагічнасць і экалагічную бяспеку. Звон – гэта сімвал міру і спакою, гэта заклік да захавання вечных каштоўнасцей Чалавецтва. Упершыню Звон прагучаў у 1954 г. у Нью-Ёрку, у штаб-кватэры ААН у Дзень Зямлі ў гонар салідарнасці жыхароў Зямлі ў пытаннях абароны планеты. Сам звон адліты з манетак, якія сабралі дзеці ўсяго свету.

Узнікла гэта свята ў XIX ст. у ЗША па ініцыятыве міністра земляробства штата Небраска, Дж. Мортона. У штаце растуць рэдкія дрэвы, якія высякаліся на будаўніцтва і дровы. Мортон прапанаваў заняцца азеляненнем, зацвердзіць Дзень дрэва і заснаваць прыз таму, хто ў гэты дзень пасадзіць найбольшую колькасць дрэў. Міжнароднае значэнне Дзень Зямлі набывае з 1970 г., калі больш за 20 млн чал. у розных краінах свету прынялі ўдзел у розных экалагічных акцыях.

Слайд «Чысты двор» нагадвае словы вядомага французскага пісьменніка Антуан дэ Сэнт-Экзюперы: «Устаў раніцай, памыўся, прывёў сябе ў парадак – і адразу ж прывядзі ў парадак сваю планету». Пры падрыхтоўцы да свята была праведзена акцыя «Чысты двор», у якой актыўна прынялі ўдзел усе класы. Падрабязная інфармацыя і фотасправаздача таксама абвяшчаецца на слайдзе.

Слайд «Год навукі» нагадвае, што 2017 г. – год навукі і запрашае ўсіх на канферэнцыю «Зямля вачыма навукі», якая адбудзецца на другім перапынку.

Канферэнцыя пачынаецца з паказу мод. Навучэнцы малодшых класаў падрыхтавалі касцюмы «Зберагоша – другое жыццё рэчаў». Навучэнцы старшых класаў зрабілі паведамленні ў выглядзе прэзентацыі па розных вучэбных прадметах:

• слайд астраномія: Зямля – самая ўнікальная планета, яе ўнікальнасць складаецца ў тым, што толькі на ёй адной з усіх планет Сонечнай сістэмы ёсць жыццё;

• слайд гісторыя: міфы і легенды, любоў да сваёй малой радзімы

• слайд мовы: розныя назвы планеты (terra.)

• слайд Зямля: вачыма юнага матэматыка Зямля гэта шар, круг …

• слайд геаграфія: глеба ўтвараецца вельмі павольна, 1 мм за 200 гадоў. А вось разбурыць яе можна вельмі хутка. За апошнія 100 гадоў на Зямлі знішчана прыкладна ¼ частка ўсіх урадлівых зямель.

• слайд біялогія: «Чорная кніга» планеты Зямля. З XVI ст. чалавецтва «піша» Чорную кнігу, у якую трапілі зніклыя з твару Зямлі жывёлы, птушкі, расліны. Лічыцца, што з 1600 г. чалавекам было знішчана больш за 260 відаў жывёл. Усе гэта павінна падштурхнуць чалавека да таго, каб задумацца над наступствамі сваіх дзеянняў.

На 3 перапынку вучням прапаноўваюцца конкурсы творчага напрамку – вучні чытаюць свае сачыненні аб Зямлі, праводзяцца конкурсы «Угадай мелодыю», «Зямля ў мастацтве», «Як называецца фільм».

На апошнім перапынку ідзе гаворка аб выніках міжнароднай акцыі «Гадзіна Зямлі», якая праводзіцца ў апошні тыдзень сакавіка. Гадзіна Зямлі — міжнародная акцыя, падчас якой WWF (Сусветны фонд дзікай прыроды) заклікае выключыць святло на адну гадзіну ў знак неабыякавасці да будучыні планеты. У гэты ж час

згасае падсветка самых вядомых будынкаў і помнікаў свету. У 2017 г. міжнародная Гадзіна Зямлі адбылася ў 10-ы раз.

Завяршаецца свята высадкай кветак на клумбы. Усім жадаючым прапануюць выйсці на гімназічны двор і высадзіць на клумбы кветкі белага і блакітнага адценняў, якія сімвалізуюць Зямлю. Нібыта ўсе яны робяць Зямле падарунак – упрыгожваюць яе, пасадзіўшы расліны. Нездарма народная прымаўка абвяшчае: «Адно дрэва пасадзіў, ужо не дарэмна жыццё пражыў!».

## РЕШЕНИЕ ВОПРОСОВ ФОРМИРОВАНИЯ ЭКОЛОГИЧЕСКИХ КОМПЕТЕНЦИЙ СТУДЕНТОВ В РАМКАХ ПРЕПОДАВАНИЯ ДИСЦИПЛИНЫ «ВВЕДЕНИЕ В СПЕЦИАЛЬНОСТЬ»

## THE SOLUTION OF QUESTIONS OF FORMATION OF ECOLOGICAL COMPETENCES OF STUDENTS IN THE FRAMEWORK OF TEACHING OF DISCIPLINE «INTRODUCTION TO SPECIALITY»

***Т. Г. Капустина, Е. Ю. Жук, Р. О. Симонахина***

***T. Kapustina, E. Zhuk, R. Simonahina***

*Белорусский государственный университет, МГЭИ им. А. Д. Сахарова БГУ,*
*г. Минск, Республика Беларусь*
*taniakapustina@mail.ru*
*Belarusian State University, ISEI BSU, Minsk, Republic of Belarus*

Важнейшая роль в решении современных экологических проблем отведена экологическому образованию, актуальной задачей которого в интересах устойчивого развития является создание совокупности педагогических условий эффективного формирования экологических компетенций.

The most important role in the solution of modern environmental problems is assigned to environmental education, the urgent task of which in the interests of sustainable development is to create the compliance of pedagogical conditions for the effective formation of environmental competencies.

*Ключевые слова:* компетентностный подход, экологические компетенции, экологическая компетентность.

*Keywords:* competency-based approach, environmental competencies, environmental competency.

Важным инструментом практической реализации экологического образования в интересах устойчивого развития является компетентностный подход, направленный на реализацию личностно-ориентированной модели образования, повышение у обучающегося уровня адаптивности к изменяющимся условиям, формирование у него профессиональной и социальной мобильности, приведение в соответствие индивидуальных потребностей и социально-значимых интересов развития общества. Реализация компетентностного подхода заключается в создании условий для развития у обучающихся способностей и умений самостоятельно делать правильный выбор и грамотно действовать в проблемных ситуациях [1].

В связи с необходимостью решения проблем экологического характера той или иной степени сложности неотъемлемым компонентом культуры каждого человека становится экологическая компетентность, как одна из необходимых промежуточных стадий в последовательном продвижении к новому образу жизни, в основе которого лежит экологический менталитет. Процесс формирования экологических компетенций направлен на формирование системы научно-практических знаний и умений, ценностных ориентаций и мировоззренческих установок поведения и деятельности, обеспечивающих ответственное отношение человека к окружающей среде и здоровью. Основными показателями экологической компетентности являются:

- осознанность своей социальной функции в новых условиях и необходимостью созидающего характера деятельности;
- способность самоопределиться в системе экологических ценностей жизни человеческого существования и ценностное отношение к окружающему миру;
- экологическое мировоззрение и экологическое мышление;
- способность воспринимать и понимать информацию в области окружающей среды, правильно ее оценивать;
- владение эколого-правовыми знаниями;
- умение моделировать и прогнозировать развитие экологических ситуаций;
- умение принимать обоснованные и выверенные с точки зрения экологии компромиссные решения и реализовывать их на практике;
- обладание навыками разрешения конфликтных эколого-экономических ситуаций правовыми средствами;
- умение оценивать и нести ответственность за свои действия и поступки [2].